# Веснік Глыбоччыны

ГАЗЕТА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ

серада, 18 ліпеня 2018 года № 57 (9817)


Вішнёвы фестываль

**КОЛЬКІ РАДАСЦІ Ў ПАГЛЯДЗЕ!**
**(ЛІПЕНЯ ЧАРОЎНЫ МІГ!).**
**У ВІШНЁВЫМ НАШЫМ САДЗЕ**
**МЫ ВІТАЦЬ ГАТОВЫ ЎСІХ!**



Фота Андрэя Панкрата.

**У ВІШНЁВЫМ САДЗЕ – АЛЕНА ДАБРАВОЛЬСКАЯ З ДАЧУШКАМІ ВЕРАНІКАЙ І ВІКАЙ.** / СТАР. 3

УДЗЕЛЬНІКАМ І ГАСЦЯМ МІЖНАРОДНАГА СВЯТА "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ" У Г.ГЛЫБОКАЕ

# ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Шчыра вітаю вас на адкрыцці Міжнароднага свята "Вішнёвы фестываль"!

Глыбоцкі край мае багатыя традыцыі і з'яўленне новых праектаў гарманічна служаць захаванню самабытнай нацыянальнай культуры. У шосты раз "Вішнёвы фестываль" сустракае гасцей з розных краін далёкага і блізкага замежжа. У гэтым годзе да вас прыязджаюць удзельнікі свята з Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Грузіі, Францыі, Польшчы. Шырыцца геаграфія фестываля, які па праве лічыцца брэндам Глыбоцкага раёна. Маштабнасць і ўзровень мерапрыемства сведчыць, што мір, сяброўства, добрасуседства, культурны дыялог з'яўляюцца фундаментам далейшага развіцця грамадства.

Праграма свята насычана цікавымі конкурсамі, спартыўнымі спаборніцтвамі, творчымі прэзентацыямі і сустрэчамі. Адметна, што да свята далучаецца і акцыя Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі "Мы – разам!", адбудуцца навукова-практычныя канферэнцыі, ярмарка прац народных майстроў. Глыбоччына заўсёды славілася таленавітымі і працавітымі людзьмі.

Упэўнены, свята дорыць людзям радасць, натхняе, вучыць клапаціцца аб роднай зямлі.

Ад усёй душы жадаю ўдзельнікам фестывалю здароўя, творчых поспехаў, дабрабыту, святочнага настрою, новых знаёмстваў і адкрыццяў!

***З павагай, Мікалай ШАРСНЁЎ,***
***старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.***

ШЧЫРА ВІТАЕМ УДЗЕЛЬНІКАЎ ШОСТАГА МІЖНАРОДНАГА СВЯТА "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ"!

# ШАНОЎНЫЯ ЗЕМЛЯКІ І ГОСЦІ ФЕСТЫВАЛЮ!

Сёлета глыбоцкая зямля сабрала ў вішнёвы карагод прадстаўнікоў розных краін, якія адчуваюць сябе адной вялікай сям'ёй. Іх еднасць і братэрства – гэта тая сіла, дзякуючы якой мацуецца мір у свеце і шчасцем поўняцца сэрцы людзей. Фестываль дае выдатную магчымасць узняцца над будзённай мітуснёй і атрымаць дзіўныя адчуванні і асалоду ад мастацкай творчасці, ад далучэння да прыгажога і ўзвышанага.

Упэўнены, што наш яркі, салодкі, спеўны, квяцісты фестываль падорыць усім, вам, паважаныя сябры, незабыўныя і самыя прыемныя ўражанні, дасць магчымасць пазнаёміцца з творчымі здабыткамі розных нацыянальных супольнасцей і дазволіць адкрыць новыя таленты, падорыць шмат адкрыццяў і прыемных сустрэч з таленавітымі людзьмі, якія прыехалі да нас з розных месцаў Беларусі і з блізкага і далёкага замежжа..

Жадаем усім удзельнікам шостага міжнароднага свята "Вішнёвы фестываль" цікавых сустрэч і знаёмстваў, жадаем радаснай асалоды ад далучэння да цудоўнага народнага мастацтва! Спадзяёмся, што ўдзел у фестывалі стане адметнай падзеяй у жыцці кожнага з вас і натхніць на новыя працоўныя і творчыя здзяйсненні. Здароўя і незабыўных захапленняў усім-усім, хто завітаў у нашу вішнёвую сталіцу!

***А. В. МОРХАТ, старшыня Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта,***
***Г. У. УНУКОВІЧ, старшыня Глыбоцкага раённага Савета дэпутатаў.***

# ПРИЕЗЖАЙТЕ В НАШ ВИШНЁВЫЙ ГОРОД!

● А. УСЦІНАЎ.

В нашей стране очень много мест, которые стоит посетить. И прежде всего, это город Глубокое. И главная причина, чтобы приехать сюда – это «Вишнёвый фестиваль», который нынче проводится в шестой раз. А во второй раз этот праздник проводится в статусе международного. Что же еще привлекает гостей и туристов в наш город, в наш край глубокский, вишнёвый?

По мнению многих наших коллег-журналистов из ряда областных и республиканских СМИ, Глубокое привлекает своей архитектурой. Во первых, это собор Рождества Пресвятой Богородицы. Храм строился с 1640 года. Согласно легенде, подземными ходами из него можно было попасть в Березвечье. Сохранившаяся часть пристройки (монастыря) -- это здание знаменито тем, что в нем когда-то ночевал Наполеон и, восхитившись его красотой, сказал, что хотел бы перенести собор в Париж и поставить его рядом с Нотр-Дамом. Под храмом находится подземелье. А напротив церкви расположен костел Святой Троицы, который был построен в 1764-1782 гг. и перестроен в начале XX века.

Уже невозможно представить Глубокое без Алеи знаменитых земляков. Она была открыта в 2012 году в рамках Дня письменности. Здесь размещены бюсты Игната Буйницкого, Элиэзера Бен-Йехуды, Язепа Дроздовича, Павла Сухого, Вацлава Ластовского, Юзефа Корсака, Алеся Дубровича, Петра Козлова и Юрия Соболевского.

Сквер молодоженов -- место, где, пожалуй, все молодожены Глубокого проводят свадебные фотосессии – также самое посещаемое туристами место. В вишнёвой столице имеется много интересных скульптурных композиций. Они посвящены семье, вишне, книге. Есть скульптурные композиции «Барон Мюнхгаузен» и «Дед-глубочанин», «Иисус и саморянка» и др.. А самой неожиданной достопримечательностью стала выставка-музей тракторов под открытым небом. Покататься на них не покатаешься, а сфотографироваться – одно удовольствие. В этом году в вишнёвой столице появились новые достопримечательности: место отдыха «Высота», Парк Поэзии, преобразилась открывшаяся в прошлом году резиденция Вишнёвой Королевы.

Абсолютное большинство этих прекрасных скульптурных композиций и мест отдыха появилось в городе благодаря прекрасным идеям и неутомимой энергии


Глубокое. "Вишнёвый фестиваль". 2017 г.

руководителя района, председателя райисполкома Олега Морхата. Вместе руководящие работники, глубочане-труженики успешно реализуют новые и новые проекты. А потому сегодня и приглашают горожане гостей: «Рады встрече в нашем вишнёвом городе!».

# «ІГРАЕМ, СПЯВАЕМ ДЛЯ ВАС!»

● А. УСЦІНАЎ. Фота аўтара.

#ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ_СУСТРЭЧЫ

Тры гады таму па прапанове і пры непасрэднай актыўнай падтрымцы старшыні райвыканкама Алега Морхата быў створаны вакальна-інструментальны ансамбль "Вішнёвы горад". Дэбютнае выступленне гэтага творчага калектыву і адбылося якраз падчас трэцяга "Вішнёвага фестывалю" ў конкурснай канцэртнай праграме "Дзве зоркі-7". Што змянілася за гэты час у жыцці і творчай дзейнасці ўдзельнікаў ВІА? Каб атрымаць адказ на гэтае пытанне аўтар гэтых радкоў патэлефанаваў дырэктару Глыбоцкага гарадскога Дома культуры. "Прыходзьце, сустрэнецеся, у іх якраз увечары рэпетыцыя", -- паведаміла Марыя Цяліца.

--"Вішнёвы горад" рыхтуецца да "Вішнёвага фестывалю", падчас якога тры гады таму і пачаўся адлік творчай дзейнасці? – гутарым з барабаншчыкам ансамбля Сяргеем Івановым.

--Гэта сапраўды так. Хочам парадаваць сваім выступленнем тых, хто сочыць за нашай творчасцю і ўсіх удзельнікаў і гасцей міжнароднага свята.

Мы ўсе аб'яднаны любоўю да музыкі, да добрай душэўнай песні. Нам прыемна ў вольную часіну збірацца разам у гарадскім Доме культуры. Умовы для рэпетыцый тут выдатныя. Таксама хачу сказаць, што нашы сэрцы поўняцца пачуццём удзячнасці кіраўніку нашага раёна Алегу Віктаравічу Морхату, які, можна сказаць, натхніў на гэтую справу, аказаў усебаковае садзейнічанне ў станаўленні калектыву.


ВІА "Вішнёвы горад":
С. Іваноў, А. Лубчонак, У. Луганаў, Р. Рагоўскі і А. Шыпёнак.

--Якія перамены адбыліся за гэтыя тры гады?

--Калектыў абнавіўся. З першапачатковага саставу засталося толькі двое – я і Андрэй Шыпёнак. Усе, хто пакінуў ансамбль, пакінуў толькі па ўважлівых прычынах: хтосьці памяняў месца жыхарства, у некага прыбавілася сямейных клопатаў у сувязі з нараджэннем дзетак. Усе мы сябруем, раім-ся, абменьваемся думкамі. Цяпер у нас новы гітарыст -- Валодзя Луганаў, на клавішных – Алена Лубчонак, Руслан Рагоўскі – на акустычнай гітары (спрабуе таксама на бас-гітары). А вакалісткай у нас Юлія Сівіцкая (на рэпетыцыі сёння адсутнічае, адправілася ў складзе глыбоцкай творчай дэлегацыі ў Віцебск, на "Славянскі базар").

Мы ўсе працуем у розных калектывах. Валодзя з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, Руслан працуе ў дзіцячай юнацкай спартыўнай школе, Андрэй Шыпёнак – у аддзеле унутраных спраў райвыканкама, Юлія – у ВУ "Глыбокаегаз", Алена Лубчонак – выкладчык Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў, я – на мясакамбінаце. Не проста збірацца разам, тым не менш стараемся пры першай жа магчымасці праводзіць рэпетыцыі, стараемся трымаць сябе ў добрай творчай форме.

--Дзе больш за ўсё вам падабаецца выступаць?

--Канешне ж, у родным вішнёвым Глыбокім. Тут нас заўсёды прымаюць надзвычай цёпла. Асабліва падабаецца выступаць на летняй сцэне, што на Цэнтральнай плошчы горада, а таксама на сцэне гарадскога Дома культуры. Пра гастрольныя паездкі пакуль не марылі. З задавальненнем удзельнічалі ў розных канцэртных праграмах.

--Што ў рэпертуары "Вішнёвага горада"?

--Ёсць уласныя музычныя кампазіцыі, але ўсё ж часцей спяваем вядомыя хіты, тыя, што падабаюцца публіцы. Песні савецкіх часоў іграем у стылі ля кавер. Апрацоўка пры дапамозе сучасных музычных інструментаў надае старым песням асаблівае гучанне. З задавальненнем іграем, спяваем для сваіх землякоў і для гасцей нашага краю.

--На шостым міжнародным свяце "Вішнёвы фестываль" чым парадуеце?

--Наш калектыў задзейнічаны ў адзін з галоўных фестывальных дзён, у тэатралізаванай праграме "Падарожжа па вішнёвай сталіцы", якая пройдзе на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы, на Цэнтральнай плошчы. Выканаем чатыры музычныя кампазіцыі, папулярныя песні мінулых гадоў "Мой адрес Советский Союз", "Тулула", "Не улетай" і "Нежность".

--Поспехаў вам і новых творчых здзяйсненняў!

# «ВІШНЁВАЯ» СЯМ'Я

● Алесь ЖЫГУНОЎ.

**УСЕ МЫ Ў СВЯТОЧНЫЯ ДНІ ЗАХАПЛЯЕМСЯ ВІШНЁВАЙ КАРАЛЕВАЙ, ГАЛОЎНАЙ ГЕРАІНЯЙ "ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ", І ЗАЎВАЖАЕМ, ШТО ВІШНЁВЫЯ СТРОІ З КОЖНЫМ ГОДАМ УСЁ БОЛЬШ І БОЛЬШ СТАНОВЯЦЦА ПАПУЛЯРНЫМІ Ў ГОРАДЗЕ. СЁННЯ ХАЧУ ПАЗНАЁМІЦЬ ВАС З ЦІКАВАЙ СЯМ'ЁЙ, НА ЯКУЮ Ў ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ ДНІ ВЫ АБАВЯЗКОВА ЗВЕРНЕЦЕ ЎВАГУ.**

Алена Дабравольская працуе ў Доме рамёстваў метадыстам па ткацтве паясоў і бісерапляценні, але здольнасцей і талентаў мае столькі, што любая справа ў яе руках гарыць. А яшчэ Алена – апантаная прыхільніца "Вішнёвага фестывалю".

--З першага ж свята я проста захварэла ім, -- прызнаецца Алена. – На маю думку, усім нам у жыцці не хапае добрай казкі. І фестывальныя дні даюць нам адчуванне таго, што яна прыходзіць к нам – яркая, сонечная, прыгожая, чароўная, і ты ўжо не ты, а гераіня гэтай фантастычнай казкі.

-- І ў якім вобразе ты бачыш сябе на фестывалі?

--Бачу сябе маладой прыгожай і – галоўнае! -- вішнёвай жанчынай. Каралева ў нас адна, а вось яе паслядоўніц можа быць шмат. К кожнаму святу я падбіраю сукенку пад колер свята і рыхтую сувеніры. Так, на першым фестывалі нарасхват ішлі мае вішнёвыя вянкі, заколкі, брошкі. Шмат цікавага прыдумала і паказала на наступных фестывалях, а к сёлетняму нашыла з лёну сумак з вішнямі, наварыла вішнёвага варэння. Закруціла ў маленькія слоікі, накрыўкі якіх уяўляюць сабой ігольніцу; варэнне з'ясі, а ігольніцай можаш карыстацца доўга.

--Ведаю, што ў санаторна-курортны комплекс "Пліса" ты вазіла ягады вішань.

-- І ягады вазіла, і варэнне. І сувеніры. Сезон вішань, таму хачу парадаваць людзей смачным варэннем. І не толькі радую, расказваю ўсім пра наш цудоўны горад, запрашаю на фестываль. І пасля маёй паездкі некалькі чалавек з Плісы прыязджалі ў Глыбокае, заходзілі ў Дом рамёстваў, каб паглядзець на сувеніры, якія мы падрыхтавалі к святу.

--Толькі паглядзець?

--Не толькі. Дзяўчына з Англіі выбрала сабе сумку з вішнямі і цешылася, што будзе ўвесь час хадзіць з ёй і ўспамінаць наш прыгожы горад. Хлопцы купілі слоічкі з варэннем. І я рада, што мае сувеніры паедуць за мяжу.

--Па традыцыі ў галоўны дзень свята, у суботу, на выставе разам з народнымі майстрамі Глыбоччыны ты будзеш сваімі сувенірамі, сваёй творчасцю праслаўляць "Вішнёвы фестываль", наш горад. А можа, паўдзельнічаеш яшчэ ў якім-небудзь святочным мерапрыемстве?

--На выставе буду са сваімі дочкамі Веранікай і Вікай. К кожнаму фестывалю я прыдумвала сабе сукенку, якая б нагадвала вішню. А летась ужо ўсе трое мы былі на святочнай плошчы ў вішнёвых сукенках. На жаль, у Беларусі я не знайшла тканіны з вішнямі, таму заказала сабе і дочкам сукенкі ў Кітаі і перашыла іх. І ў гэтым годзе ўсе ўбачаць нас такіх прыгожых у такіх адметных сукенках. Дарэчы, сёлета мяне запрасілі прыняць удзел у навукова-практычнай канферэнцыі па садаводстве, і я згадзілася і хачу расказаць пра кнігу "Паданне пра прыгажосць, каханне і дабрыню", яе напісала мая сяброўка Ганна Прашкевіч. У кнізе расказваецца пра пана, які прывёз з-за мяжы вішню і пасадзіў. І так сталася, што аднойчы сустрэў бедную дзяўчыну і, уражаны прыгажосцю, параўнаў яе з вішняй і захацеў ажаніцца з ёй. А дзяўчына сказала: "Пайду замуж за цябе толькі тады, калі ў кожным двары будуць цвісці вішні". І пану прыйшлося ва ўсіх дварах садзіць вішні. А мястэчка, дзе гэта ўсё адбывалася, сталі зваць вішнёвай сталіцай.




--Мяркую, што паданне звязана з горадам Глыбокае.

--Так. Ведаеце ж песню, якая гучыць на фестывалях? "Глыбокае маё, вішнёвы гарадок, такая вось вішнёвая сталіца".

--Алена, "Вішнёвы фестываль" – тваё любімае свята. А ягады вішні?

--І ягады. Любім іх усёй сям'ёй. Раблю тарты з вішнямі, піражкі, варэнікі, дзецям вару кампоты кожны дзень. Вішня на стале ў гэтыя дні ў нас заўсёды.

--А як ставіцца да свята муж?

--Раней думала, што не так, як мы з дочкамі, але цяпер змяніла сваю думку: на рабочым стале камп'ютара ўбачыла фота, на якім мы трое – у вішнёвых сукенках.

Падчас размовы з Аленай Дабравольскай напярэдадні 8 сакавіка (гл. матэрыял "А сімвал свята – мімоза", змешчаны ў № 19 "ВГ" за 6 сакавіка) яна прызналася, што шмат чаго добрага ў яе жыцці ўжо адбылося. Але дзве мары ўсё ж застаюцца. І адна з іх – пабачыць фотаздымак свой і сваіх дачок у вішнёвых сукенках на першай паласе "Весніка Глыбоччыны".

Мы рады, што адна мара гэтай абаяльнай і таленавітай маладой жанчыны збылася.

# КВІТНЕЙ, КРАСУЙ, ВІШНЁВАЯ СТАЛІЦА!

● Галіна СУТУЛА. Фота з архіва сада-яслаў №1.

#КОНКУРСЫ

**У № 31 ЗА 19 КРАСАВІКА ГЭТАГА ГОДА Ў НАШАЙ ГАЗЕЦЕ БЫЎ АБ'ЯЎЛЕНЫ КОНКУРС "ВІШНЁВЫ САД".**


Педагогі і выхаванцы дзіцячага садка-яслаў №1 "Вішнёвая казка" разам са старшынёй райвыканкама Алегам Морхатам закладваюць вішнёвы сад.

Яго арганізатары – раённы выканаўчы камітэт, упраўленне сельскай гаспадаркі і харчавання, аддзел жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама праз удзел у ім запрашалі прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы горада, а таксама яго жыхароў памножыць спадчыну агранома-селекцыянера Баляслава Лапыра і падтрымаць імідж вішнёвай сталіцы. Ідэю арганізатараў падтрымалі цэнтральная бібліятэчная сістэма, гарадскі Дом культуры, тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН), СШ№1 і Залеская сярэдняя, Мярэцкаўская базавая школы, Глыбоцкая дзіцячая мастацкая школа імя Я. Драздовіча.


"Будзем расці разам з вішнёвым садам!" – гавораць дзяўчынкі.

--Дзякуем усім, хто падтрымаў гэтую добрую ініцыятыву. Што датычыць вынікаў конкурсу, то ў лік пераможцаў трапілі чатыры гарадскія ўстановы, -- гаворыць начальнік аддзела архітэктуры, будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Міхаіл Ясюкевіч. -- Першае месца заняла СШ№1 імя П. Сухога. Вучні і настаўнікі пасадзілі найбольшую колькасць вішнёвых саджанцаў – 53! На другім месцы – дзіцячы сад-яслі "Вішнёвая казка", што ў мікрараёне Паўночным. Адзначу, што вішнёвы сад – а гэта 14 дрэўцаў чарэшняў "Іпуць" -- там быў закладзены ў кастрычніку мінулага года. Разам з педагогамі і юнымі выхаванцамі маладыя дрэўцы садзіў тады старшыня райвыканкама Алег Морхат, які гэтую ідэю і прапанаваў. Сёлета ў вішнёвым садзе папаўненне: 3 мая выхавальнікі і дзеці пасадзілі яшчэ 9 дрэўцаў. Трэцяе месца раздзялілі гарадскі Дом культуры і тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Работнікі культуры пасадзілі 11 вішнёвых дрэўцаў трох гатункаў, і ТЦСАН – 12 саджанцаў. Віншуем пераможцаў і жадаем, каб дрэўцы прыжыліся і праз два-тры гады парадавалі не толькі вясновай квецценню, але і шчодрым ураджаем.

# У КАДРЫ З ВІШНЯЙ

● Алена ХАЙНОЎСКАЯ. Фота з архіва цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Сёлетняй вясной вішнёвыя дрэўцы былі белыя-белыя ад квецені, улетку – чырвоныя-чырвоныя ад ягад. Выдатны фон для фотаздымкаў! Быццам бы ведалі пра гэта арганізатары, якія аб'явілі раённы конкурс "Сэлфі з вішняй" і прапанавалі прыняць у ім удзел усім жадаючым.

– У конкурсе паўдзельнічалі не толькі арганізацыі і жыхары Глыбоччыны, але нават і прадстаўніца Лёзненскага раёна. Нам даслалі каля 30 здымкаў. Усе яны па-свойму цікавыя. Многія з канкурсантаў падышлі неадынарна да іх выканання. Фотаздымкі можна будзе ўбачыць падчас "Вішнёвага фестывалю" на выставе ў экспазіцыйнай зале цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці (вул. Леніна, 40), – расказала Валянціна Спасібёнак, дырэктар Глыбоцкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. Гэтая ўстанова разам з аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама выступілі арганізатарамі конкурсу.


Вішнёвае дзяцінства глыбоцкай вішанькі з вуліцы Яснай – Марыны Мяцеліцы.

Нагадаем, што аматарам сэлфі былі прапанаваны наступныя намінацыі –"Я + Вішня", "Я + Сябры + Вішня", "Вішнёвае дзяцінства". І па словах Валянціны Цімафееўны ў апошняй намінацыі ўдзельнікаў было нашмат больш, чым у астатніх.

– На працягу першых фестывальных дзён падвядзём вынікі "Сэлфі з вішняй", агучым іх у адзін з апошніх фестывальных дзён, – адзначыла Валянціна Спасібёнак.


Глыбачанін Яўген Шынкевіч + Вішня.

Мы ж – нецярплівыя, Канешне, не дачакаліся святочнай выставы, паглядзелі на конкурсныя работы загадзя. І хаця многія з іх цяжка назваць сэлфі *(само слова англійскага паходжання, літаральна яго можна перавесці як «сам» або «сама». Гэты тэрмін абазначае асаблівую разнавіднасць "фотааўтапартрэта". Адрозніваюць два віды сэлфі-здымкаў: прамы (фатаграфія на тэлефон або планшэт з дапамогай выцягнутай рукі) і люстраны (чалавек здзяйсняе здымак на мабільнае ўстройства з дапамогай люстэрка. –* ***аўт.****)*, затое фотаздымкі атрымаліся такімі непасрэднымі, вельмі мілыя і сімпатычныя – проста зачараванне! Некаторыя мы выбралі, каб парадаваць і вас, нашы чытачы, шчырымі ўсмешкамі аматараў вішанек. Усміхніцеся разам з намі! У кадры – глыбачане з вішняй! І прыхільнікі глыбоцкай вішанькі з Ліёзна.


Аксана Князева з Ліёзна + кот Патрык + Вішня.

А сэлфі яшчэ навучымся рабіць і пакажам на наступным VII "Вішнёвым фестывалі" ў Глыбокім!

# ГЛЫБОЦКІЯ ХІТЫ ВІШНЁВАЙ КУЛІНАРЫІ

***У шосты раз фанфары абвясцілі аб адкрыцці ў Глыбокім міжнароднага свята "Вішнёвы фестываль". І ўжо закружыла фестывальная віхура: змяняюць адна другую святочныя падзеі, адно мерапрыемства абяцае быць цікавей за другое. Тут і канцэрты, і конкурсы, выставы, спартыўныя гульні, дзелавыя канферэнцыі, форумы і вясёлыя забаўляльныя шоу-праграмы… Але ж, даражэнькія сябры, атрымоўваецца, святкаваць гэтак жа, як і працаваць, – нялёгка. Нялёгка вытрымліваць фестывальны марафон. Паходзіш, падзівіся, паспяваеш, патанчыш – падсілкавацца хочацца.***

***А гаспадары фестывалю завіхаюцца, стараюцца гасцей дарагіх усім смачненькім пачаставаць, здзівіць чым-нібудзь гэткім вішнёвенькім! Сталы сапраўды ломяцца ад смакаты вішнёвай.***

## ВІШНЯ З МЯСАМ: АРЫГІНАЛЬНАЕ СПАЛУЧЭННЕ



Вішнёвы дэсерт – смаката вядомая. Хаця, канешне, здзівілі ўсіх падчас мінулых фестываляў майстры-тэхнолагі Глыбоцкага малочнакансервавага камбіната, асвоіўшы выпуск малака згушчанага з вішняй. Вось бы адведаць яшчэ якой-небудзь незвычайнай стравы з вішнямі. Аказваецца, мяса выдатна спалучаецца з вішнямі. І вось яна -- прадукцыя арыгінальней не бывае. Уласная распрацоўка спецыялістаў Глыбоцкага мясакамбіната. Спецыяльна да "Вішнёвага фестывалю" яны пастараліся і сёння прапануюць… шашлык "Глыбоцкі вішнёвы". "Вішнёвы шашлык – быць такога не можа", -- прадбачу пярэчанне кагосьці са скептыкаў. Але ж, вішнёвы! Для марынавання выкарыстоўваецца адборная свініна, натуральныя прыправы. А ў якасці марынада – воцатная заліўка і натуральны вішнёвы сок. У гандлёвых кропках прадукцыя рэалізуецца ў ёмкасцях 0,9 і 1,9 кілаграма.

А на фестывальных пляцоўках трымайце, сябры, нос па ветры, каб сарыентавацца, дзе вішнёвы шашлык гатуецца.

І гэта яшчэ не ўсе вішнёвыя дзівосы ад глыбоцкіх мясаперапрацоўшчыкаў. Хітовай навінкай сярод мясных вырабаў стане варана-вэнджаная каўбаса "Глыбоцкая з вішанькай". Так-так, яна сапраўды з вішнёвым пахам, а ўнутры гэтай каўбаскі ёсць кавалачкі сушаных вішняў.

Але хопіць размоў, лепш адправімся па гандлёвых фестывальных радах, каб рознай вішнёвай смакаты адведаць.

# ПРЫСМАКІ АД ГЛЫБОЦКАГА ХЛЕБАЗАВОДА

Вішня – асноўны індыгрыент у салодкай прадукцыі, якую выпускае ў гэтыя дні Глыбоцкі хлебазавод. Пра апошнія вішнёвыя навінкі ў асартыменце кандытарскіх і хлебабулачных вырабаў расказалі нашаму карэспандэнту майстры-хлебапёкі прадпрыемства.



Выконваючая абавязкі начальніка лабараторыі хлебзавода Алена Гусева дэманструе торт "Чарэшневы сад".

Без тортаў у нас ніводнае свята не абыходзіцца. Да сёлетняга "Вішнёвага фестывалю" на хлебазаводзе падрыхтавалі тры навінкі. Першая – гэта торт "Вішня на снезе". Назва хоць і зімовая, а пах такі летні, вішнёвы. Што сабой уяўляе гэтая смаката? У аснове – прапітаны бісквіт, праслоены крэмам на раслінных вяршках з вішнёвым джэмам. Верх гэтага торта ўпрыгожаны такім жа крэмам, а таксама зацукраванай чарэшняй і пасыпаны цукровай пудрай.

Другі кулінарны хіт вішнёвага сезона ад хлебазавода – торт "Чарэшневы сад". Яго складнікі: прапітаны бісквіт, пакрыты слівова-фруктовым крэмам і закручаны ў выглядзе рулета. Паверхня такога торта ўпрыгожана раслiннымі вяршкамі, зацукраванай чарэшняй, а таксама шакаладнай глазурай і какосавымі стружкамі. Трэці торт называецца "Ёгуртоша". Яго аснова --прапітаны бісквіт, праслоены крэмам з раслінных вяршкоў і вішнёвым ёгуртам. Верх торту ўпрыгожаны такім жа крэмам, шакаладнай і малочнай глазурай.



Мяркуем, да спадобы прыйдуцца глыбачанам і гасцям горада піражнае "Вішнёвы сюрпрыз", пірог "Вішнёвы край", булачка "Вішнёвая фантазія" і слойка "Светлагорская", начыненая вішнёвым джэмам.

І зусім новы від прадукцыі, асвоены глыбоцкімі хлебапёкамі. Гэта вырабы слаёныя "Корн мікс", дзе ў якасці зерневай пасыпкі выкарыстоўваецца насенне льна, сланечніка і кунжута.

• А. УСЦІНАЎ. Фота Наталлі БЕЛЬСКАЙ і з архіва УП "Глыбоцкі мясакамбінат".

# ВІШНЁВЫЯ ПЕРНІКІ ПА-ГЛЫБОЦКУ

• Алена ХАЙНОЎСКАЯ.
Фота аўтара і Марыны ВАСІЛЕЎСКАЙ.

**ГЛЫБАЧАНКА МАРЫНА ВАСІЛЕЎСКАЯ ЯК ПААБЯЦАЛА, ТАК І ЗРАБІЛА: ЯЕ ФІРМОВЫЯ ПЕРНІКІ ДА "ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ" ГАТОВЫ!**



Марына Васілеўская з сыночкам Яраславам.

У адным з сакавіцкіх нумароў нашай газеты мы расказвалі пра Марыну і яе смачныя, прыгожыя, яркія пернікі. Гэтым рамяством ці мастацтвам (можна і так назваць) глыбачанка пачала займацца ў кастрычніку мінулага года і разам з новымі кулінарнымі мядова-імбірнымі творамі сустракала святы: Новы год, Дзень закаханых, Дзень абаронцаў Айчыны, і Дзень жанчын. І якраз падчас нашай з ёй сустрэчы напярэдадні 8-га Сакавіка пернікавых спраў майстар паабяцала, што да "Вішнёвага фестывалю" таксама абавязкова падрыхтуецца.

І вось яны – пернікі-вішанькі! Чырвоненькія, бліскучыя, быццам сонейка іх прамеьчыкамі лашчыць. Ёсць і пернікі-сардэчкі з атрыбутамі фестывалю, з гербам Глыбокага – адмыслова для гасцей, каб ведалі, дзе пабывалі і адчулі смак "Вішнёвага фестывалю".

– А рэцэпт у вішнёвых пернікаў асаблівы? – пытаюся ў Марыны.

– Так. Звычайна я раблю пернікі мядовыя, дабаўляючы імбір і карыцу. У вішнёвыя ж я дадала іншыя спецыі: гваздзіку, кардамон, імбір. Мёд замяніла жа на "жжёны" цукар, каб вішнёвыя пернікі не былі такімі салодкімі. Усё ж такі глыбоцкая вішанька адрозніваецца ад іншых не слодычу, а кіслінкай, – расказвае Марына ля століка з пернікавым багаццем.

Паказаць маміны кулінарныя шэдэўры пагадзіўся і паўтарагадовы Яраслаў. Праўда, для паказу смачны вішнёвы "твор", зроблены рукамі любімай мамачкі, з роцику не хацеў выпускаць, – цукеркі-вішанькі такія смачныя!







# «ВІШНЁВАЕ» ПАДАРОЖЖА: ГЛЫБОКАЕ – САМАХВАЛАВІЧЫ

• Тэкст і фота Алеся ЖЫГУНОВА.

**УЖО СТАЛА ТРАДЫЦЫЯЙ, ШТО Ў ДНІ “ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ” ПРАХОДЗІЦЬ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА САДАВОДСТВЕ. У ЁЙ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ І НАВУКОЎЦЫ ІНСТЫТУТА ПЛАДАВОДСТВА, ЯКІ РАЗМЕШЧАНЫ Ў АГРАГАРАДКУ САМАХВАЛАВІЧЫ.**
**ДУМКА ЎЗНІКЛА НЕЧАКАНА: “А ЧАМУ Б НАМ САМІМ НАПЯРЭДАДНІ СЁЛЕТНЯГА ФЕСТЫВАЛЮ НЕ ПАБЫВАЦЬ У ГЭТЫМ ЗНАКАМІТЫМ ПАСЁЛКУ, КУДЫ ПА САДЖАНЦЫ ПЛАДОВЫХ ДРЭЎ ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ ЦІ НЕ З УСЁЙ КРАІНЫ?”.**


Дырэктар Інстытута пладаводства кандыдат сельскагаспадарчых навук Аляксандр Таранаў у вішнёвым садзе.


Вішня на адной з вуліц Самахвалавічаў.





Кандыдат біялагічных навук Таццяна Красінская.


Кандыдат сельскагаспадарчых навук Людміла Фралова.

І восьмы ў дарозе. Вядома, перад паездкай прыйшлося пагартаць падшыўкі раённай газеты “ВГ” за мінулыя пяць гадоў, дзе змяшчаліся справаздачы з такіх канферэнцый, зазірнуць у інтэрнэт, каб атрымаць інфармацыю пра Самахвалавічы і ўвогуле па вішнёвай тэматыцы, якая ў гэтыя дні цікавіць усіх жыхароў Глыбоччыны.

Дарога не здоўжылася – ад Мінска да аграгарадка ўсяго 12 кіламетраў, – і вось перад намі ўжо замаячыў указальнік : Самахвалавічы. “Цікавая назва, выходзіць, аграгарадок сам хваліць сябе. А ці ёсць за што?” – гэта было першае пытанне, якое ўзнікла адразу ж пасля таго, як мы зрабілі першыя крокі па мясцовым бруку. Да замоўленай сустрэчы з дырэктарам Інстытута пладаводства Аляксандрам Таранавым мелі мінут дваццаць, таму вырашылі бліжэй пазнаёміцца з пасёлкам. Вядома, найперш Самахвалавічы славяцца сваімі сельскагаспадарчымі інстытутамі (ёсць тут і Інстытут гароднінаводства), і мы наведалі абедзве ўстановы, якія блізка – праз дарогу – знаходзяцца адна ад другой.

Прайшлі па бліжэйшых вуліцах пасёлка. Кінулася ў вочы тое, што каля дамоў (розных: і шыкоўных катэджаў, і звычайных) – шмат цяпліц, а таксама садоў, у тым ліку і вішнёвых. Канечне, ж вішні нас цікавілі найбольш. І вось што заўважылі: ураджай у Самахвалавічах, як і ў Глыбокім, сёлета багаты, на дрэвах – “вішнёвы” пажар, і, што самае цікавае, – на галінках ягады вісяць не па адной, па дзве, па тры, а цэлымі гронкамі, як вінаград, – а вось лісця нашмат менш, чым на глыбоцкіх вішнях.

…Кароценькае знаёмства з Самахвалавічамі прывяло нас да думкі, што пасёлак цікавы, адметны, але ў тым, што ён сапраўды апраўдвае сваю назву, канчаткова ўпэўніліся, калі разам з дырэктарам інстытута кандыдатам сельскагаспадарчых навук Аляксандрам Таранавым пабывалі ў вішнёвым садзе, што раскінуўся за пасёлкам.

У садзе, плошча якога паўтара гектара, мы правялі больш за гадзіну. Тут сабрана багатая калекцыя – 300 гатункаў вішнёвых дрэў. Калі шчыра, то гэта была незвычайная экскурсія: Аляксандр Аляксандравіч вадзіў нас ад аднаго рада дрэў к другому, пры гэтым падрабязна расказваў пра адметнасць кожнага гатунку: пра яго прадуктыўнасць, устойлівасць к хваробам, смакавыя асаблівасці. “Вянок”, “Грыот беларускі”, “Жывіца”, “Памяці Енікеева”, “Ласуха”, “Русінка”, “Жадана”, “Скромніца”, “Харытонаўская” “Несвіжская”,“Мілавіца”… Розныя сарты – розныя характарыстыкі. Так, адзін з гатункаў дае багаты ўраджай, другі – больш устойлівы к хваробам, якіх, на жаль, не так і мала, трэці – сумяшчае ў сабе першае і другое.

Зачараваныя і ўражаныя ўсім гэтым вішнёвым багаццем, мы ўважліва слухалі аповед Аляксандра Аляксандравіча і пры гэтым …не забывалі з кожнага дрэўца зрываць па ягадцы: акрамя ўсяго іншага, нас цікавіў і смак іх. Прывёзшы ў падарунак дырэктару вядзерца глыбоцкіх вішань, мы як патрыёты свайго горада ўсё ж спадзяваліся, што смак іх будзе ацэнены належна, што плады глыбоцкай вішні калі не лепшыя, то ва ўсякім разе не горшыя за тыя, якія мы смакавалі ў вішнёвым садзе інстытута.

–Так, ёсць своеасаблівы рэйтынг вішань па іх смаку, – заўважыў вучоны. – Спецыяльная камісія праводзіць дэгустацыю пладоў і па пяцібальнай сістэме выстаўляе балы. І лідарамі тут гатункі “Жывіца” і “Равесніца” – 4,8 бала.

–А “Глыбоцкая”, – пацікавіліся мы?

–Ваша вішня адна з самых рэйтынгавых – 4,5 бала.

І з настроем, які пасля гэтых слоў яшчэ больш узняўся, мы прадоўжылі сваё падарожжа і ўрэшце спыніліся каля вішнёвага рада, дзе сярод іншых дрэў годна высілася і наша “зямлячка” – вішня “Глыбоцкая”. І як тут было не ўспомніць пра нашага земляка, агранома Баляслава Лапыра, які разводзіў у Глыбокім вішні і вывеў некалькі новых гатункаў. Пра глыбоцкую вішню нават легенда ёсць, што яна асаблівая, хоць і з кіслінкай, але смачная, такая, што нават костачка вішні рассмоктваецца. Хацелі расказаць легенду Аляксандру Аляксандравічу, але разважылі: паколькі ён прымаў ужо ўдзел у Глыбокім у навукова-практычных канферэнцыях па садаводстве, то не мог не чуць яе.

–І сёлета чатыры супрацоўнікі прыедуць к вам на канферэнцыю, – як бы прачытаў нашы думкі Аляксандр Аляксандравіч. – Ваш “Вішнёвы фестываль” – гэта цудоўны праект. Адзіны ў краіне, знакавы. Проста здорава, што ў вас ёсць такая традыцыя. Развівайце яе і далей..

– Перад паездкай у Самахвалавічы адзін з жыхароў Глыбокага падзяліўся са мной сваёй бядой: у яго прапалі вішні. Кажа, што, магчыма, не там пасадзіў.

–Прычына можа быць не ў гэтым. Як часам у нас бывае? Дзед пачаў садзіць сад, пасля перадаў сваё захапленне сыну, той – свайму сыну… Але ж гэта не значыць, што вырошчванне вішань трэба аддаваць на волю лёсу, пасадзіў і – чакай ураджай. У гэтай справе вельмі важны пэўны мікраклімат, абавязкова павінны быць садаахоўныя палосы, якія вы бачыце ў нашым вішнёвым садзе. І выбіраць трэба дрэвы, якія хутка растуць, скажам, таполі. У нас вы бачыце бярозы, ліпы, елкі. Прафілактычныя апрацоўкі – абавязковыя. У сваёй большасці мясцовыя гатункі вішань выдзяляюцца ва ўмовах, калі апрацовак зусім не было.

–Вы пра хімію?

–Так. Гэта хімія, абарона ад усіх хвароб. У нашым садзе мы робім чатыры-пяць апрацовак, але гэта не прэсінг, беларускія гатункі пры такім падыходзе цудоўна сябе адчуваюць. Дарэчы, і гэты прэс можна зменшыць за кошт устойлівых гатункаў.

–А можна вырошчваць вішні без хіміі? Маю на ўвазе арганічнае пладаводства.

–Можна, калі гэта гатунак “Несвіжская”. Дарэчы, і глыбоцкая вішня не толькі адна з лепшых у краіне па смакавых уласцівасцях, але і па ўстойлівасці к хваробам.

–Аляксандр Аляксандравіч, ваш інстытут практычна можа чымнебудзь памагчы жыхарам Глыбокага, якія вырошчваюць вішні?

